**Справаздча**
**аб рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм) у 2017 годзе**

Зводная гадавая справаздача аб рэалізацыі дзяржаўных праграм у 2017 годзе сфарміравана на аснове гадавых справаздач, прадстаўленых адказнымі заказыкамі ў пастаянную міжведамасную камісію па дзяржаўных праграмах, і змяшчае інфармацыю аб выкананні 20 дзяржаўных праграм, а таксама ацэнку іх эфектыўнасці.

***Даведка.*** *У пералік дзяржаўных праграм на 2016 – 2020 гады, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 лютага 2016 г. № 148, уключана 21 праграма. Аднак па Дзяржаўнай праграме інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 – 2020 гады прадугледжаны асобны парадак маніторынгу.*

На рэалізацыю дзяржаўных праграм у 2017 годзе накіравана больш за 61 млрд. рублёў, у тым ліку з бюджэту – 17,4 млрд. рублёў[1].

Справаздачы адказных заказчыкаў аб рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм) у 2017 годзе разглядаліся на пасяджэннях пастаяннай міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах. Кожная справаздача ўключала ацэнку эфектыўнасці рэалізацыі праграмы (падпраграмы), методыка якой уключана ў саму праграму.

Побач з ацэнкай эфектыўнасці, прадстаўленай адказнымі заказчыкамі, міжведамаснай камісіяй па дзяржаўных праграмах улічваліся дадатковыя крытэрыі, якія дазваляюць больш глыбока прааналізаваць вынікі рэалізацыі канкрэтнай дзяржаўнай праграмы. Так, прымалася пад увагу ступень выканання ўсіх мерапрыемстваў, аб’ёмы фінансавання (па ўсіх крыніцах), дасягненне планавых значэнняў паказчыкаў, у тым ліку на рэгіянальным узроўні, ступень рэалізацыі асобных падпраграмм.

Міжведамаснай камісіяй па дзяржаўных праграмах з 20 праграм ацэнены як высокаэфектыўныя дзевяць праграм, эфектыўныя – шэсць праграм, сярэднеэфектыўныя – пяць.

У працэсе рэалізацыі дзяржаўных праграм у 2017 годзе выканана 268 мэтавых паказчыкаў з 327, 44 зводныя мэтавыя паказчыкі з 51.

[1] Паводе інфармацыі, прадстаўленай у справаздачах адказных заказчыкаў дзяржаўных праграм.

У выніку рэалізацыі мерапрыемстваў **Дзяржаўнай праграмы аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва** на 2016 – 2020 гады (адказны заказчык Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва):

знізіўся ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя (на 01.01.2018 ён склаў 0,5 працэнта ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва, на 01.01.2017 – 0,8 працэнта);

павялічаны ўзровень працаўладкавання беспрацоўных (склаў 58 працэнта ад колькасці тых, хто мае патрэбу ў працаўладкаванні, пры мэтавым паказчыку 48,1 працэнта);

зніжаны ўзровень траўматызму на вытворчасці на 15,34 працэнта і ўзровень прафесійных захворванняў на 13,14 працэнта;

зменшана на 8 працэнтаў колькасць працоўных месцаў са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы ў арганізацыях;

ахоплена сацыяльнай дапамогай па месцы жыхарства 89,8 тысяч непрацаздольных грамадзян; паслугі сядзелкі аказаны 1 626 непрацаздольным грамадзянам і 197 сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў;

сацыяльнымі паслугамі ў межах дзяржаўнага сацыяльнага заказу ахоплена 2 637 непрацаздольных грамадзян.

Па выніках года з 22 мэтавых і зводных мэтавых паказчыкаў не дасягнуў запланаванага значэння адзін мэтавы паказчык – «*Узровень забяспечанасці інвалідаў тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі*»: пры спрагназаваным значэнні 64 100 чалавек факт склаў 63 134 (ступень выканання – 98,5 працэнта).

У 2017 годзе запланавана 148 мерапрыемстваў у сферы сацыяльнай абароны насельніцтва, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці палітыкі занятасці насельніцтва, паляпшэння ўмоў аховы працы, стварэння безбар'ернага асяроддзя, забеспячэння сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў і пажылых грамадзян. Цалкам выканана 138 мерапрыемстваў, у тым ліку:

створана 1 227 (пры плане – 656) даступных для інвалідаў і фізічна аслабленых асоб аб'ектаў у прыярытэтных сферах жыццядзейнасці (ахова здароўя, адукацыя, культура, сацыяльная абарона і інш.);

аказана садзейнічанне ў працаўладкаванні 173,1 тыс. чалавек (61,1 працэнта ад тых, хто мае патрэбу ў працаўладкаванні); з мэтай стымулявання працоўнай мабільнасці грамадзян аказана садзянне ў перасяленні на новае месца жыхарства і працы 136 сем'ям беспрацоўных грамадзян;

аказаны паслугі па прафарыентацыі 79 тыс. грамадзян; разнастайнымі мерапрыемствамі прафарыентацыйнай накіраванасці ахоплена 46,6 тыс. навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі;

працаўладкавана на забраніраваныя працоўныя месцы больш за 7,1 тыс. беспрацоўных з ліку тых, хто мае патрэбу ў дадатковых гарантыях занятасці;

накіравана на адаптацыю да працоўнай дзейнасці з кампенсацыяй выдаткаў наймальніку па аплаце працы 549 інвалідаў, прафінансаваны і кампенсаваны выдаткі наймальнікам на стварэнне і захаванне 39 працоўных месцаў для працаўладкавання інвалідаў;

забяспечана часовая працоўная занятасць 31,2 тыс. школьнікаў, навучэнцаў і студэнтаў у вольны ад вучобы час (129,5 працэнта да запланаванага);

аказана садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай, рамеснай дзейнасці, а таксама дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму з аказаннем фінансавай падтрымкі шляхам прадастаўлення субсідый 1,8 тыс. беспрацоўных, у арганізацыі прыватных унітарных прадпрыемстваў – 16 беспрацоўным, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак – 11, рамеснай дзейнасці – 286, дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму – 15 беспрацоўным;

выраблена больш за 128,9 тыс. сродкаў рэабілітацыі (артапедычны абутак, вырабы лячэбнага пратэзавання і інш.);

забяспечана крэсламі-калыскамі каля 9 тыс. інвалідаў;

праведзена абсталяванне арганізацый аховы здароўя рэабілітацыйным і фізіятэрапеўтычным абсталяваннем (накіравана больш за 170 тыс. рублёў на закупку трэнажораў, апарата ўдарна-хвалевай тэрапіі, іншага абсталявання);

прадастаўлены субсідыі недзяржаўным некамерцыйным арганізацыям на рэалізацыю 72 дагавароў на аказанне сацыяльных паслуг інвалідам і пажылым грамадзянам, заключаным у межах дзяржаўнага сацыяльнага заказу (67 з іх заключаны ў 2017 годзе);

адаптавана на тэлеканалах для асоб з парушэннем слыху больш за 700 гадзін тэлевізійнага прадукту;

забяспечана функцыянаванне 156 аддзяленняў тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН), якія забяспечваюць дзённае знаходжанне для інвалідаў;

***Даведка.*** *Аддзяленні ТЦСАН на пастаяннай аснове наведвала больш за 5,1 тыс. інвалідаў, больш за 10 тыс. пажылых грамадзян. Для непрацаздольных грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, якія не могуць пражываць самастойна, у ТЦСАН функцыянавала 62 аддзяленні кругласутачнага знаходжання на 2 125 месцаў.*

праведзены абследаванні ўмоў жыцця ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, пацярпелых ад наступстваў войнаў асоб, адзінокіх пажылых людзей і адзінокіх інвалідаў I і II групы. Абследавана 201,5 тыс. грамадзян названых катэгорый, з іх больш за 56 тыс. чалавек атрымалі дапамогу, з іх 11,4 тыс. чалавек – дадатковую сацыяльную падтрымку ў выглядзе рамонту жыллёвых памяшканняў.

На фінансаванне праграмы накіравана 429,46 млн. рублёў (96,3 працэнта ад плана), у тым ліку з бюджэту 425 млн. рублёў (96,1 працэнта ад плана).

Паводле ацэнкі адказнага заказчыка, рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з’яўляецца высокаэфектыўнай.

Рашэннем міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016 – 2020 гады прызнана высокаэфектыўнай.

Вынікі рэалізацыі мерапрыемстваў **Дзяржаўнай праграмы «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь» на 2016 – 2020 гады** (адказны заказчык Міністэрства эканомікі) у 2017 годзе наступныя:

павялічылася колькасць суб’ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (далей – МСП) у рэспубліцы і склала 25,8 на 1 тыс. занятых у эканоміцы (у 2016 годзе – 24,4);

вырасла колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў: на 1 тыс. занятых у эканоміцы іх 54,3 (у 2016 годзе – 53,6);

павялічана да 99 адзінак колькасць цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва (заданне 98 адзінак);

праведзена цэнтрамі падтрымкі прадпрымальніцтва 6 228 навучальных курсаў (заданне – 3 290 курсаў).

Па выніках года не забяспечана дасягненне планавых значэнняў зводных мэтавых паказчыкаў:

«*Удзельная вага валавога дададзенага кошту, якая фарміруецца суб’ектамі МСП, у валавым дададзеным кошце*» – 28,4 працэнта пры плане 29,3 працэнта;

«*Удзельная вага занятых у мікраарганізацыях, малых і сярэдніх арганізацыях, а таксама індывідуальных прадпрымальнікаў і прыцягнутых імі наёмных асоб у агульнай колькасці занятых у эканоміцы*» – 30,4 працэнта пры плане 30,8 працэнта.

З сямі мэтавых паказчыкаў не дасягнуў запланаванага значэння адзін – «*Колькасць інкубатараў малога прадпрымальніцтва*»: пры планавым значэнні 28 інкубатараў факт склаў 24. Невыкананне гэтага паказчыка, на думку адказнага заказчыка, абумоўлена недастаткова актыўнай працай аблвыканкамаў па прыцягненні арганізацый для рэгістрацыі ў якасці інкубатараў малога прадпрымальніцтва, а таксама ўключэнню ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2012 г. № 294 з мэтай стварэння на іх аснове суб’ектаў інфраструктуры падтрымкі МСП.

У межах праграмы на 2017 г. прадугледжвалася рэалізацыя 34 мерапрыемстваў, з якіх у поўным аб’ёме выканана 31, у тым ліку:

працягнулася рэалізацыя Плана дзеянняў па паляпшэнні рэйтынгавых пазіцый Рэспублікі Беларусь у справаздачы Сусветнага банка «Вядзенне бізнесу» (у справаздачы «Вядзенне бізнесу 2018» Беларусь заняла 38-е месца сярод ахопленых гэтым даследаваннем 190 дзяржаў);

аказвалася дзяржаўная фінансавая падтрымка суб’ектам малога прадпрымальніцтва за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, а

таксама сродкаў Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў (у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 мая 2009 г. № 255);

працягнута аказанне фінансавай падтрымкі суб'ектаў МСП шляхам прадастаўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» партнёрам (банкам і лізінгавым арганізацыям) рэсурсаў для фінансавання дзейнасці суб'ектаў МСП;

створана 9 цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва на тэрыторыі раёнаў з колькасцю насельніцтва звыш 30 тыс. чалавек.

З мэтай далейшага ўдасканалення ўмоў вядзення бізнесу ўнесены ва Урад Рэспублікі Беларусь праекты ўказаў Кіраўніка дзяржавы, накіраваныя на:

скарачэнне колькасці ліцэнзуемых відаў дзейнасці, спрашчэнне патрабаванняў і ўмоў іх ажыццяўлення;

аптымізацыю адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца па заявах юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;

змяненне падыходаў да аказання дзяржаўнай фінансавай падтрымкі суб'ектаў МСП.

На фінансаванне праграмы ў 2017 годзе накіравана 128,35 млн. рублёў (118,5 працэнта ад плана), у тым ліку:

са сродкаў рэспубліканскага бюджэту – 2,34 млн. рублёў (98,7 працэнта ад планавага аб'ёму);

з бюджэтаў абласцей і г. Мінска – 4,52 млн. рублёў (31 працэнта ад плана) з улікам сродкаў, размешчаных у банкаўскія дэпазіты для рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 мая 2009 г. № 255 «Аб некаторых мерах дзяржаўнай падтрымкі малога прадпрымальніцтва»;

уласныя сродкі БФФПП – 0,12 млн. рублёў (9,2 працэнта ад запланавага аб'ёму);

сродкі ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» – 121,32 млн. рублёў (134,8 працэнта ад планавага аб'ёму);

іншыя крыніцы (сродкі міжнароднай тэхнічнай дапамогі) – 0,05 млн. рублёў (27,5 працэнта ад планавага аб'ёму).

Па ацэнцы адказнага заказчыка, рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з'яўляецца эфектыўнай.

Пастаяннай міжведамаснай камісіяй па дзяржаўных праграмах дадзеная адзнака падтрымана.

Рэалізацыя мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы **«Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь»** на 2016 – 2020 гады (адказны заказчык Міністэрства аховы здароўя) дазволіла:

павялічыць чаканую працягласць жыцця пры нараджэнні да 74,4 гадоў пры плане 74,3 года;

стабілізаваць смяротнасць працаздольнага насельніцтва (3,9 праміле ў 2016 г. і ў 2017 г.) і агульную смяротнасць ад хвароб сістэмы кровазвароту (690 выпадкаў на 100 тыс. насельніцтва, што таксама адпавядае ўзроўню 2016 г.) (паводле папярэдніх дадзеных);

знізіць захворванне насельніцтва на туберкулёз і, як следства, смяротнасць ад туберкулёзу (3 выпадкі на 100 тыс. чалавек у 2017 г., 3,5 выпадку на 100 тыс. чалавек ў 2016 г.);

зменшыць спажыванне алкаголю на душу насельніцтва з 8,8 літра ў 2016 г. да 7,9 літра;

павялічаны ахоп камбінаванай антырэтравіруснай тэрапіяй ВІЧ-пазітыўных пацыентаў, якія маюць патрэбу ў лячэнні, да 91,25 працэнта;

нарошчаны аб'ёмы транспланталагічнай дапамогі насельніцтву (зроблена 79 трансплантацый печані, 352 – нырак, 6 – комплексу «нырка-падстраўнікавая залоза», 39 – сэрца, 5 – лёгкіх, у тым ліку ў рэгіёнах праведзена 159 трансплантацый ныркі).

Дасягнута запланаванае значэнне зводнага мэтавага паказчыка «*Чаканая працягласць жыцця пры нараджэнні*».

З 22 мэтавых паказчыкаў выканана 19. Не дасягнулі запланаваных значэнняў 3 мэтавыя паказчыкі:

зніжэнне паказчыка «*Сумарны каэфіцыент нараджальнасці*» да 1,541 нараджэнняў пры плане 1,72 (у 2016 г. – 1,73 нараджэння), а таксама рэзкае скарачэнне *міграцыйнага прыросту* (3,8 тыс. чалавек пры плане 13 тыс. чалавек) сведчыць аб недастаткова эфектыўнай палітыцы ў адпаведных галінах і патрабуе прыняцця дадатткових мер;

рост *смяротнасці насельніцтва ад выпадковых атручванняў алкаголем* (15,5 выпадку на 100 тыс. чалавек у 2017 г. супраць 15,4 выпадку на 100 тыс. чалавек ў 2016 г.) звязаны, у першую чаргу, са спажываннем насельніцтвам фальсіфікаванага і кантрафактнага алкаголю.

З прадугледжаных да рэалізацыі ў 2017 годзе 249 мерапрыемстваў у межах выдзеленага фінансавання выкананы ў поўным абъёме 192 (77,1 працэнта), 25 мерапрыемстваў на 1 студзеня 2018 г.– у працэсе выканання. Не выканана 32 мерапрыемствы.

Фінансавае забеспячэнне праграмы склала 4 953,8 млн. рублёў (94,9 працэнта ад запланаванага), у тым ліку са сродкаў бюджэту 4 633,8 млн. рублёў (94,3 працэнта ад плана).

Праведзены аналіз рэалізацыі дзяржаўнай праграмы паказвае на сістэмны характар (аналагічна 2016 году) незасвоеных бюджэтных сродкаў па прычыне няспраўджаных працэдур дзяржаўных закупак (у сувязі з працягласцю правядзення працэдуры закупкі альбо неадпаведнасцю прапаноў па абсталяванні распрацаванаму тэхнічнаму заданню). Так, у 2017 г. па 4 мерапрыемствах не праведзена працэдура дзяржаўных закупак. Акрамя таго, па 15 мерапрыемствах працэдура не адбылася па 26 пазіцыях.

Па ацэнцы адказнага заказчыка, рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з’яўляецца высокаэфектыўнай.

Прымаючы пад увагу вышэйназваныя праблемы, пастаянная міжведамасная камісія па дзяржаўных праграмах прыняла рашэнне аб паніжэнні ступені эфектыўнасці рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» да эфектыўнай.

Дзяржаўная праграма **«Адукацыя і моладзевая палітыка»** на 2016 – 2020 гады (адказны заказчык Міністэрства адукацыі) накіравана на павышэнне якасці і даступнасці адукацыі, развіццё патэнцыялу моладзі і яе прыцягненне да грамадска карыснай дзейнасці. Вынікі рэалізацыі мерапрыемстваў у 2017 годзе наступныя.

З мэтай забеспячэння даступнасці дашкольнай адукацыі ўведзена ў эксплуатацыю 13 устаноў дашкольнай адукацыі на 2 500 месцаў. Гэтыя і іншыя прынятыя меры дазволілі ў 2017 годзе стварыць каля 8,8 тыс. дадатковых месцаў у дзіцячых садках, павялічыць на 1,1 працэнтных пункта ахоп дзяцей ва ўзросце ад аднаго да 6 гадоў установах дашкольнай адукацыі (з 74,8 працэнта у 2016 г. да 75,9 працэнта у 2017) і на 0,5 працэнтаных пункта *ахоп дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў*. Разам з тым фактычнае значэнне паказчыка «*Ахоп дзяцей ад 3 да 6 гадоў ўстановамі дашкольнай адукацыі*» ніжэй запланаванага на 0,1 працэнтных пункта.

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўлялася аптымізацыя сеткі, абнаўленне зместу і вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыі. Да 2017/2018 навучальнага года забяспечаны перагляд навучальных праграм па ўсіх вучэбных прадметах. У 2017 годзе выдадзена 50 навучальных дапаможнікаў, з іх – 41 новы падручнік. Для ўмацавання матэрыяльнай базы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі набыта абсталяванне для 200 кабінетаў хіміі.

Даступнасць і варыятыўнасць сістэмы спецыяльнай адукацыі рэспублікі дазваляе забяспечваць высокі *ахоп інклюзіўнымі формамі адукацыі асоб з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця*, які па выніках года складае 86,2 працэнта (пры запланаваным узроўні да 2020 г. – 80 працэнта).

***Даведка.*** *Спецыяная адукацыя – навучанне і выхаванне навучэнцаў, якія з’яўляюцца асобамі з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця, праз рэалізацыю*

*адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўнях дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі.*

*Ахоп дзяцей і моладзі дадатковай адукацыяй* склаў 56 працэнта.

*Выпушчана 30,5 тыс. рабочых (служачых) з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, 32,3 тыс. спецыялістаў (рабочых) з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй,* што дазволіла ў цэлым забяспечыць заказ эканомікі ў кваліфікаваных кадрах. З улікам тэхнічных і тэхналагічных змяненняў у эканоміцы *падрыхтавана 16,2 тыс. рабочых з павышаным узроўнем кваліфікацыі (4-ы разрад і вышэй),* што склала 53,1 працэнта ад агульнага выпуску (у 2016 г. – 51,2 працэнта).

У мэтах інтэграцыі сістэмы адукацыі і эканомікі, фундаментальнай і прыкладной навукі ў 2017 г. *адкрыта 92 філіялы кафедраў устаноў вышэйшай адукацыі ў арганізацыях краіны.*

*Адаптыўнае адукацыйнае асяроддзе, у тым ліку і безбар'ернае, створана* у 2 393 установах дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, што складае 36 працэнтаў ад іх агульнай колькасці (на 5,7 працэнта больш, чым ў 2016 годзе).

З мэтай павышэння якасці адукацыі ў адпаведнасці з запытамі рынку працы абноўлены некаторыя адукацыйныя стандарты па спецыяльнасцях асноўнай і дадатковай адукацыі дарослых. Так, *удзельная вага абноўленых адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі* па 9 працэнтаў (адпавядае заданню), *вышэйшай адукацыі* – 4,5 працэнта (план – 2 працэнта), *дадатковай адукацыі дарослых* – 29,7 працэнта (план – 21).

*Удзельная вага прыёму ў аспірантуру (ад'юнктуру) па прыярытэтных спецыяльнасцях навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, неабходных для развіцця высокатэхналагічнай вытворчасці, якая адносіцца да V і VI тэхналагічных укладаў эканомікі,* склала 18,4 працэнта (план – 15,6). *Удзельная вага выпуску з абаронай дысертацыі ў межах устаноўленага тэрміну навучання з аспірантуры і дактарантуры* – 7,4 працэнта і 19,6 працэнта адпаведна (планавыя значэнні – 5,8 працэнта і 16,5 працэнта).

*Прынята на навучанне па спецыяльнасцях ядзернай энергетыкі* на I ступень вышэйшай адукацыі 125 чалавек, сярэдняй спецыяльнай адукацыі – 50 чалавек. Для дзяржаўнага прадпрыемства «Беларуская АЭС» падрыхтавана 16 спецыялістаў за мяжой.

У выніку рэалізацыі мерапрыемстваў падпраграмы «Моладзевая палітыка»:

*удзельная вага колькасці маладых людзей, якія ўдзельнічаюць у мерапрыемствах грамадзянска-патрыятычнай накіраванасці,* склаў 81,8 працэнта (план – 76 працэнта);

забяспечаны *ахоп маладых людзей прафілактычнымі акцыямі і мерапрыемствамі* на 78,6 працэнта (план – 74 працэнта);

*ахоплена рознымі відамі працоўнай дзейнасці* 76,1 тыс. маладых людзей (план – 70,1 тыс.);

*уцягнута ў валанцёрскі (добраахвотны) рух* 58,2 тыс. маладых людзей (план – 58 тыс.);

*уцягнута ў дзейнасць па развіцці моладзевага самакіравання (парламенты, студэнцкія і моладзевыя саветы, саветы маладых навукоўцаў і іншае)* больш за 104 тыс. маладых людзей (план – 78,4 тыс.).

Дасягнуты планавыя значэнні двух зводных мэтавых і 32 (з 38) мэтавых паказчыкаў. Пры гэтым ступень выканання чатырох з шасці нявыкананых паказчыкаў досыць высокая.

***Даведка.*** *«Ахоп дзяцей ад 3 да 6 гадоў установамі дашкольнай адукацыі» – фактычнае значэнне 95,8 працэнта пры плане 95,9 працэнта;*

*«Доля выхавальнікаў і настаўнікаў, якія маюць вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыі» – 48,9 працэнта і 76,3 працэнта адпаведна (план – 49,9 працэнта і 76,5 працэнта);*

*«Доля фактычна асвоеных сродкаў у агульным аб'ёме вылучанага на рэалізацыю падпраграмы 10 фінансавання» – 97,6 працэнта.*

Фактычнае значэнне паказчыка «*Удзельная вага прыёму ў аспірантуру для прадпрыемстваў і арганізацый рэальнага сектара эканомікі*» склала 1,6 працэнта пры планавым значэнні 3,7 працэнта. Такім чынам, задача «Забеспячэнне цеснага ўзаемадзеяння навукі і адукацыі з вытворчымі прадпрыемствамі шляхам пашырэння падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі для рэальнага сектара эканомікі» не вырашана ў поўным аб'ёме.

Другі год запар не выконваецца паказчык «*Колькасць устаноў вышэйшай адукацыі, якія ўвайшлі ў 4 000 лепшых універсітэтаў свету па рэйтынгу Webometrics*», вызначаны Праграмай – 2020 як сведчанне дасягненняў нацыянальнай сістэмы адукацыі. Насуперак прагнозу, толькі пяць устаноў увайшлі ў мэтавую групу (план – 9 універсітэтаў, факт 2016 г. – 6).

На 2017 г. планавалася рэалізацыя 153 мерапрыемстваў, з якіх у межах выдзеленых сродкаў выканана ў поўным аб'ёме 117 (76,5 працэнта), часткова – 26. У сувязі з адсутнасцю фінансавання 10 мерапрыемстваў не выконвалася.

У ходзе рэалізацыі праграмы асвоена 5 427,81 млн. рублёў (95,5 працэнта ад запланаванага аб'ёму), з іх 4 943 млн. рублёў (95,7 працэнта) – сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Асноўныя прычыны эканоміі – правядзенне аптымізацыйных мерапрыемстваў, ажыццяўленне закупак на конкурснай аснове і інш.

Па ацэнцы адказнага заказчыка, рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з’яўляецца высокаэфектыўнай. Ацэнка пацверджана рашэннем міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах.

У працэсе рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы **«Культура Беларусі»** на 2016 – 2020 гады (адказны заказчык Міністэрства культуры):

праведзены рэстаўрацыйныя работы па захаванні помнікаў архітэктуры: аднаўленне згубленых адметных асаблівасцяў і канструкцый, падтрыманне належнага тэхнічнага стану, прыстасаванне пад новыя функцыі аб’ектаў спадчыны (на гэтыя мэты выдаткавана 1,67 млн. рублёў);

выконваліся капітальня рамонты будынкаў і збудаванняў бібліятэк, музеяў, галерэй, выставачных залаў, паркаў культуры і адпачынку, заапаркаў, набыццё абсталявання і іншых асноўных сродкаў для іх (асвоена 4,74 млн. рублёў);

набыта 236,1 тыс. экзэмпляраў дакументаў для папаўнення бібліятэчнага фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі;

ажыццяўлялася страхаванне дарагой маёмасці (на гэтыя мэты выдзелена 101,2 тыс. рублёў): застрахаваны будынкі 15 устаноў, у тым ліку – Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Мемарыяльнага комплексу Брэсцкая крэпасць-герой, Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Замкавага комплексу «Мір»;

тэатральна-відовішчнымі, клубнымі і іншымі арганізацыямі культуры праведзена больш за 617 тыс. мерапрыемстваў;

завершана рэканструкцыя і рамонт комплексу будынкаў і збудаванняў кінастудыі «Беларусьфільм» (у 2017 годзе ўведзена ў эксплуатацыю);

з дзяржаўнай падтрымкай выраблена кінастудыяй «Беларусьфільм» і недзяржаўнымі вытворцамі 36 фільмаў, у тым ліку кінастудыяй – 33;

дзяржаўнымі архіўнымі ўстановамі прынята на пастаяннае захоўванне ад арганізацый больш за 85 тыс. адзінак захоўвання кіраўніцкай дакументацыі, каля 2,5 тысяч – навукова-тэхнічнай дакументацыі, больш за 1 тыс. кінадакументаў, 255 фонадакументаў, каля 8 тыс. фотадакументаў, 325 відэадакументаў, 34 электронныя дакументы;

дзяржаўнай установай культуры «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур» праведзена за мяжой (Латвія, Літва, Эстонія, Расія, Польшча, Італія, Ізраіль, Кітай) 12 мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю беларускай культуры і беларускай мовы.

У 2017 годзе ў межах праграмы выконвалася 43 мерапрыемствы, з іх не выканана ў поўнай меры 7.

***Даведка.*** *Асноўнай прычынай няпоўнага выканання мерапрыемстваў з’яўляецца неасваенне сродкаў у поўным аб’ёме. Так, на выкананне мерапрыемства «Забеспячэнне захаванасці гісторыка-культурных каштоўнасцей і доступу да іх, фарміраванне Банка звестак аб гісторыка-*

*культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь» выдаткавана каля 80 працэнтаў ад запланаванага аб’ёму фінансавання, на мерапрыемства «Страхаванне дарагой і ўнікальнай дзяржаўнай маёмасці» – 81,2 працэнта, «Папаўненне музейнага фонду і стварэнне экспазіцый» – 71,3 працэнта.*

Па выніках года дасягнута запланаванае значэнне ўсіх 5-і зводных мэтавых паказчыкаў і 16 (з 18) мэтавых паказчыкаў.

Асноўным фактарам, якія паўплывалі на невыкананне паказчыка «*Колькасць наведванняў публічных бібліятэк, у тым ліку выдаленымі карыстальнікамі*», з’яўляецца скарачэнне колькасці публічных бібліятэк на 5,8 працэнта у 2016 годзе.

***Даведка.*** *Дадзены паказчык паказвае прырост колькасці наведванняў да ўзроўню 2015 года, які ў 2017 годзе павінен быў скласці 8 працэнтаў, фактычнае выкананне – 7,3 працэнта.*

Другі год запар не выконваецца паказчык «*Колькасць бізнес-форумаў з удзелам беларусаў замежжа з ліку прадпрымальнікаў, якія праводзяцца ў Рэспубліцы Беларусь*»: пры плане 5 адзінак у 2017 годзе праведзена адно такое мерапрыемства (у 2016 годзе – два). Прычыны невыканання ў справаздачы адказнага заказчыка не называюцца.

На фінансаванне праграмы накіравана 517,49 млн. рублёў (97,7 працэнта ад запланаванага аб’ёму), у тым ліку са сродкаў дзяржаўнага бюджэту 403 млн. рублёў (94,5 працэнта ад плана).

Па ацэнцы адказнага заказчыка, рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з’яўляецца высокаэфектыўнай.

Рашэннем міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах рэалізацыя праграмы «Культура Беларусі» прызнана высокаэфектыўнай.

Па выніках рэалізацыі ў 2017 годзе мерапрыемстваў Дзяржаўнай **праграмы развіцця фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь** на 2016 – 2020 гады (адказны заказчык Міністэрства спорту і турызму):

павялічылася колькасць насельніцтва рэспублікі, уцягнутага ў сістэматычныя заняткі фізічнай культурай і спортам (больш за 2,19 млн. чалавек, або 23,1 працэнта насельніцтва краіны);

павялічылася загрузка фізкультурна-спартыўных збудаванняў у сярэднім па рэспубліцы да 81,6 працэнта, што на 2,5 працэнта вышэй, чым ў 2016 годзе;

дасягнута 25 месца Рэспублікі Беларусь у спартыўным рэйтынгу краін па алімпійскіх дысцыплінах. Гэтаму спрыялі вынікі выступленняў беларускіх спартсменаў на чэмпіянатах, Кубках, першынствах свету і Еўропы;

***Даведка.*** *Заваявана 647 медалёў (у 2016 годзе – 542 медалі), у тым ліку 177 залатых, у алімпійскіх дысцыплінах на чэмпіянатах свету заваявана 8 медалёў.*

арганізавана правядзенне ў Беларусі шэрагу буйных міжнародных спартыўных спаборніцтваў, сярод якіх моладзевы чэмпіянат Еўропы па фехтаванні, чэмпіянат свету па тайландскім боксе, чэмпіянаты Еўропы па самба, па шахматах, па сучасным пяцібор'і, Кубак Еўропы па лёгкай атлетыцы ў бегу на 10 000 м і іншыя.

Дасягнута запланаванае значэнне абодвух зводных мэтавых паказчыкаў і 10 мэтавых паказчыкаў з 11. Не выкананы мэтавы паказчык «*Доля навуковых праектаў, укаранёных у практычную дзейнасць*», што адказны заказчык тлумачыць складанасцю абароны даследчых работ у галіне спартыўнай навукі ў сувязі з адсутнасцю пры Дзяржаўным камітэце на навуцы і тэхналогіях профільнага дзяржаўнага экспертнага савета па фізічнай культуры і спорце, а таксама нізкай якасцю падрыхтоўкі навуковых прац у галіне спартыўнай навукі.

У 2017 годзе з прадугледжаных да выканання 14 мерапрыемстваў у межах выдзеленага фінансавання выкананы ў поўным аб'ёме 13 (92,9 працэнта).

На фінансаванне праграмы ў 2017 годзе выдзелена 384,16 млн. рублёў (89,4 працэнта ад плана), у тым ліку 383,7 млн. рублёў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, што складае 89,3 працэнта ад запланаванага аб'ёму.

Згодна з ацэнкай адказнага заказчыка, рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з'яўляецца высокаэфектыўнай.

Рашэннем міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы развіцця фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь прызнана высокаэфектыўнай.

Падчас рэалізацыі мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы **«Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе»** на 2016 – 2020 гады (адказныя заказчыкі: Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Міністэрства энергетыкі, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю) дасягнуты наступныя вынікі:

забяспечана выкананне сацыяльных стандартаў у галіне ЖКГ;

праведзены работы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў;

прадастаўлены субсідыі на пакрыццё часткі выдаткаў па аказваемых насельніцтву жыллёва-камунальных паслугах, а таксама льготы па аплаце ЖКП;

аптымізаваны схемы цеплазабеспячэння населеных пунктаў з ліквідацыяй неэфектыўных кацельняў;

выкананы капітальны рамонт жыллёвага фонду ў запланаваных аб'ёмах;

павялічана колькасць аб'ектаў бытавога абслугоўвання ў раённых цэнтрах і сельскай мясцовасці.

Па выніках года выкананы ў поўным аб'ёме зводны мэтавы паказчык «*Зніжэнне выдаткаў на аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву ў супастаўных умовах да папярэдняга года*».

Па дадзеных адказных заказчыкаў, з 13 мэтавых паказчыкаў выканана ў поўным аб'ёме 9 (або 69,2 працэнта).

Па падпраграмах 1 – 6 (адказны заказчык Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі) з 10 мэтавых паказчыкаў 8 выканана ў поўным аб'ёме.

Па падпраграме 7 «Развіццё электраэнергетыкі і газіфікацыі вёскі» (адказны заказчык Міністэрства энергетыкі) з двух мэтавых паказчыкаў у поўным аб'ёме выкананы адзін.

Па падпраграме 8 «Якасць і даступнасць бытавых паслуг» (адказны заказчык Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю) з двух паказчыкаў выкананы адзін. Недавыкананне па паказчыку «*Тэмпы росту аб'ёмаў аказання бытавых паслуг да папярэдняга года ў супастаўных цэнах*» склала 2,1 працэнта. Разам з тым паказчык «*Прырост аб'ектаў бытавога абслугоўвання ў раённых цэнтрах і сельскай мясцовасці*» перавыкананы ў 57 разоў, што сведчыць пра недастаткова якаснае планаванне значэнняў асобных паказчыкаў.

Міжведамаснай камісіяй па дзяржаўных праграмах звернута ўвага на падыходы да ацэнкі паказчыкаў і мерапрыемстваў дзяржпраграмы: мерапрыемствы і паказчыкі ацэненыя як выкананыя ў агульным па рэспубліцы за кошт перавыканання іх у адных абласцях пры недасягненні значэнняў іншымі абласцямі. Так, напрыклад, мерапрыемства 9 «Абсталяванне цеплавых вузлоў, цэнтральных і індывідуальных цеплавых пунктаў шматкватэрных жылых дамоў, аб'ектаў цепла-і водазабеспячэння, водаадвядзення (каналізацыі), вонкавага асвятлення сістэмамі аўтаматызацыі і дыспетчарызацыі, якія знаходзяцца на абслугоўванні арганізацый ЖКГ сістэмы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі» Гомельскай вобласцю выканана на 45,3 працэнта, у той час як Магілёўскай – на 185,1 працэнта. Пры гэтым у цэлым мерапрыемства ўказана як выкананае.

На фінансаванне праграмы ў 2017 годзе накіравана 1 846,01 млн. рублёў (101,67 працэнта ад плана), у тым ліку са сродкаў бюджэту 1 618,5 млн. рублёў (117,3 працэнта ад запланавага аб'ёму).

Па ацэнцы адказнага заказчыка (МЖКГ), рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з'яўляецца высокаэфектыўнай.

Аднак, улічваючы ступень выканання паказчыкаў і мерапрыемстваў у цэлым пры фактычным узроўні фінансавання дзяржпраграмы, рашэннем міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» прызнана сярэднеэфектыўнай.

У выніку выканання мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы **«Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў»** на 2016 – 2020 гады (адказны заказчык Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя):

забяспечаны прырост запасаў карысных выкапняў: нафта – 0,641 млн. тон пры заданні 0,6 млн. тон, прэсныя воды – 29,50 тыс. куб. метраў у суткі пры заданні 10 тыс. куб. метраў;

паменшаны аб’ём выкідаў парніковых газаў да 91 млн. тон (пры плане 91,8 млн. тон) і аб’ём выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных і мабільных крыніц (склаў 1 243 тыс. тон пры плане 1 245 тыс. тон).

Дасягнута запланаванае значэнне ўсіх 5 зводных мэтавых паказчыкаў і 48 з 53 мэтавых паказчыкаў. Не ў поўнай меры выканана 5 паказчыкаў.

***Даведка.*** *Адказным заказчыкам называюцца наступныя прычыны няпоўнага выканання гэтых паказчыкаў.*

*«Колькасць пунктаў назіранняў, аснашчаных аўтаматычнымі метэаралагічнымі станцыямі» і «Ступень аўтаматызацыі метэаралагічных назіранняў» – у сувязі з тым, што ўвод у эксплуатацыю двух аўтаматызаваных метэаралагічных вымяральных сістэм (АМВС) прадугледжаны ў першым квартале 2018 года (з прычыны іх пастаўкі ў снежні 2017 г.);*

*«Скідванне недастаткова ачышчаных сцёкавых вод у паверхневыя водныя аб’екты (скарачэнне ў 2020 годзе на 50 працэнтаў да ўзроўню 2015 года)» – не выкананы па прычыне неэфектыўнай працы камунальных ачышчальных збудаванняў Мінскай вобласці (скід недастаткова ачышчаных сцёкавых вод у вобласці – 3,05 млн. куб. метраў, што складае 69 працэнта ад агульнага іх аб’ёму па рэспубліцы);*

*«Вывад з эксплуатацыі трансфарматараў, якія змяшчаюць поліхлараваныя біфенілы» – недасягненне значэння паказчыка абумоўлена тым, што трансфарматары, якія змяшчаюць ПХБ, у параўнанні з кандэнсатарамі, з’яўляюцца буйнагабарытным абсталяваннем, для забеспячэння вываду якога з эксплуатацыі (дэмантажу, замены на альтэрнатыўнае абсталяванне) патрабуецца ўкладанне вялікіх фінансавых сродкаў арганізацый – іх уласнікаў (уладальнікаў). Фінансаванне такіх работ з іншых крыніц, апроч уласных сродкаў арганізацый, у 2017 годзе не было прадугледжана;*

*«Колькасць устаноўленых інфармацыйных і інфармацыйна-ўказальных знакаў, рэкламна-інфармацыйных шчытоў» зменшылася ў сувязі са змяненнем кошту адзінкі прадукцыі.*

Дзяржаўнай праграмай у 2017 годзе прадугледжана да выканання 215 мерапрыемстваў, з якіх 212 выканана ў поўным аб’ёме, у тым ліку:

у галіне абыходжання з адходамі, прадухілення шкоднага ўздзеяння адходаў на навакольнае асяроддзе набывалася спецыяльная тэхніка па вывазу цвёрдых камунальных адходаў, а таксама кантэйнеры для паасобнага збору адходаў;

у галіне аховы і рацыянальнага выкарыстання аб’ектаў расліннага свету праводзіліся мерапрыемствы па барацьбе з інвазіўным чужароднымі відамі раслін (баршчэўнік Сасноўскага), набываліся сродкі для абароны раслін ад шкоднікаў і хвароб, а таксама пасадачны матэрыял;

праводзіліся работы па добраўпарадкаванні, азеляненні, паляпшэнні стану тэрыторый населеных пунктаў, паркаў, лесапаркаў, сквераў, бульвараў, набярэжных і іншых аб’ектаў азелянення.

У 2017 годзе фінансавае забеспячэнне дзяржаўнай праграмы склала 46,47 млн. рублёў (61 працэнта ад плана), у тым ліку са сродкаў бюджэту 42,2 млн. рублёў (74,3 працэнта ад запланавага аб’ёму).

Па ацэнцы адказнага заказчыка, рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» у 2017 годзе з’яўляецца высокаэфектыўнай.

Рашэннем міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах эфектыўнасць рэалізацыі гэтай праграмы таксама прызнана высокай.

Прынятыя ў 2017 годзе меры па рэалізацыі мерапрыемстваў **Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС** на 2011 – 2015 гады і на перыяд да 2020 года (адказны заказчык Міністэрства па надзвычайных сітуацыях) дазволілі:

прадаставіць ільготы і выплаціць кампенсацыі пацярпелым ад катастрофы грамадзянам пад заяўленую патрэбу;

арганізаваць бясплатнае харчаванне 118 тыс. навучэнцаў, якія атрымліваюць агульную базавую і сярэднюю адукацыю і якія пражываюць на тэрыторыі радыёактыўнага забруджвання;

забяспечыць у неабходным аб’ёме мерапрыемствы па санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні пацярпелых грамадзян: з 160 тыс. грамадзян, якія маюць права і магчымасць выехаць на лячэнне або аздараўленне, скарысталіся названай ільготай 96,5 тыс. грамадзян, у тым ліку 87 тыс. дзяцей (ахоп санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы дзяцей склаў 55,7працэнта);

правесці агляд у арганізацыях аховы здароўя рэспублікі 1 491,9 тыс. чалавек, у тым ліку 254 тыс. дзяцей і падлеткаў, якія стаяць на дыспансерным уліку (усяго знаходзіцца на ўліку 1,5 млн. чалавек);

набыць 5 адзінак сучаснага лячэбнага абсталявання для дзіцячых рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтраў на агульную суму 8,4 тыс. рублёў.

Выканалі 3 зводныя мэтавыя паказчыкі з 4 і 12 мэтавых паказчыкаў з 18. Не атрымалася дасягнуць запланаваныя значэнні па мэтавых паказчыках: «*Вапнаванне кіслых глеб*», «*Пастаўка фосфарных угнаенняў*», «*Пастаўка калійных угнаенняў*», «*Вяртанне выдаткаў на набыццё сродкаў хімічнай абароны*», «*Выкананне работ па дагляду на пашах, створаных для жывёлы*

*асабістых падсобных гаспадарак*», «*Правядзенне радыялагічнага абследавання сельскагаспадарчых земляў*».

Недасягненне паказчыкаў адказны заказчык тлумачыць недастатковай працай заказчыкаў па выкананні неабходных мерапрыемстваў.

Праграмай у 2017 г. прадугледжана да выканання 38 мерапрыемстваў, з якіх выканана ў поўным аб’ёме 25 (65,8працэнта ад запланаваных), у тым ліку:

забяспечана вытворчасць прадукцыі, адпаведнай рэспубліканскім і міжнародным нарматывам па ўтрыманні радыёнуклідаў (становчыя тэндэнцыі зніжэння вытворчасці харчовых прадуктаў, забруджаных радыёнуклідамі вышэй дапушчальных узроўняў, пацверджаны дадзенымі радыяцыйнага кантролю);

выкананы будаўнічыя работы на 128 аб’ектах, з кіх 76 уведзена ў дзеянне;

здадзены ў эксплуатацыю 222 кватэры агульнай плошчай 10,9 тыс. кв. м;

газіфікавана 1 215 жылых дамоў, пракладзена 151,5 км газаправодных сетак, 43 км водаправодных сетак, 4,3 км дарог і вуліц;

завершаны работы па будаўніцтве пяці станцый абезжалезвання і адной артэзіянскай свідравіны;

зроблена рэканструкцыя памяшканняў і будаўніцтва аперацыйнага блока Магілёўскага абласнога анкадыспансера, добраўпарадкавана тэрыторыя Слаўгарадскай раённай бальніцы;

праведзена штогадовая рэспубліканская дабрачынная акцыя «Калядная ёлка – нашы дзеці», Міжнародная сацыяльна-творчая праграма «У будучыню з надзеяй».

У 2017 г. фінансавае забеспячэнне праграмы склала 455,3 млн. рублёў са сродкаў бюджэту (94,6 працэнта ад плана).

Па ацэнцы адказнага заказчыка, рэалізацыя праграмы ў 2017 годзе з’яўляецца высокаэфектыўнай.

Прымаючы пад увагу значныя долі не выкананых у поўным аб’ёме мэтавых паказчыкаў (41,1 працэнта ад агульнай колькасці) і мерапрыемстваў (34,2 працэнта), выніковая ацэнка эфектыўнасці рэалізацыі зніжана. Рашэннем міжведамаснай камісіі па дзяржаўных праграмах рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС прызнана эфектыўнай.

Рэалізацыя мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «**Беларусь гасцінная**» на 2016 – 2020 гады (адказны заказчык Міністэрства спорту і турызму) у 2017 годзе дазволіла забяспечыць дасягненне значэння зводнага мэтавага паказчыка «*Экспарт турыстычных паслуг*» у аб’ёме 201,9 млн. долараў ЗША (або 128,5 працэнта да плана). Гэтаму спрыялі разам з іншым распрацоўка новых экскурсій, абнаўленне экскурсійных маршрутаў,

правядзенне абавязковай атэстацыі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў (у тым ліку гідаў-перакладчыкаў з кітайскай мовы), арганіцыя ўдзелу нацыянальнага стэнда Рэспублікі Беларусь у 13 міжнародных турыстычных выставах і інш. мерапрыемствы.

Дасягнуты запланаваныя значэнні чатырох мэтавых паказчыкаў. Не выканана два мэтавыя паказчыкі.

Прычыны невыканання паказчыка «*Колькасць замежных грамадзян, якія наведалі Рэспубліку Беларусь*» (94,8 працэнта ад плана) – змяненне структуры колькасці замежных грамадзян, якія наведалі рэспубліку, з прычыны росту ўдзельнай вагі транзітных турыстаў, якія перасякаюць беларуска-расійскую мяжу.

***Даведка.*** *Нацыянальным статыстычным камітэтам распрацаваны Метадалагічныя падыходы па ацэнцы міжнароднага ўязнога турыстычнага патоку Рэспублікі Беларусь з улікам беларуска-расійскага ўчастка мяжы, згодна з якімі адзначаецца станоўчая дынаміка: з улікам беларуска-расійскага ўчастка мяжы колькасць замежных грамадзян, якія наведалі нашу краіну, склала ў 2017 годзе 9,5 млн. чалавек.*

